ПРАГРАМА
КРАЎЦОВА
2027–2031

ПРАГРАМА КРАЎЦОВА: 11 ВЫМЯРЭННЯЎ

Іван Краўцоў / План устойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь

01 · ПАЛІТВЯЗНІ

Вызваленне ўсіх палітвязняў да канца 2027 года з правам застацца ў Беларусі і пісьмовымі перапрашэннямі ад суда і следчага.

02 · ПРАВА І СВАБОДЫ

Канстытуцыя 1994 года на рэферэндуме 25 сакавіка 2028 года, новы Крымінальны кодэкс і аўтаматычнае аднаўленне партый, арганізацый і СМІ.

03 · ВЯРТАННЕ

Рэжым бяспечнага вяртання, пашпарты ў консульствах у дзень звароту і 500 тысяч грамадзян, якія вярнуліся да 2030 года.

04 · МОВА І СІМВАЛЫ

Бела-чырвона-белы сцяг і «Пагоня» як дзяржаўныя сімвалы, беларуская мова як асноўная мова справаводства, школ і эфіру да 2031 года.

05 · ДЗЯРЖАЎНЫ АПАРАТ

Адказнасць толькі за гвалт і катаванні, захаванне пасад для астатніх службовых асоб пасля атэстацыі на веданне Канстытуцыі.

06 · САНКЦЫІ

Прыпыненне санкцый на час выканання праграмы, аднаўленне ў максімальным аб'ёме і роспуск Палаты прадстаўнікоў пры адмове ад рэформаў.

07 · ЭКАНОМІКА І ЎЛАСНАСЦЬ

Рост ВУП не ніжэй за 10% штогод, сярэдні заробак на польскім узроўні і вяртанне канфіскаванай маёмасці з кампенсацыяй.

08 · СУВЕРЭНІТЭТ

Вывад расійскай ядзернай зброі і войскаў да канца 2028 года і пастаянны нейтралітэт, зацверджаны Генеральнай Асамблеяй ААН.

09 · ВАЙНА І МІР

Спыненне любога ўдзелу ў вайне супраць Украіны і мірнае пагадненне ў Мінску, гарантам якога выступае Беларусь.

10 · ЕЎРОПА

Бязвізавы рэжым з 2029 года, статус кандыдата ў члены ЕС у 2030 годзе і беларуская мова як 25-я афіцыйная мова саюза.

11 · ПЕРАМОВЫ І ВЫБАРЫ

Адзіная перамоўная дэлегацыя дэмакратычных сіл, пераходны ўрад з Аб'яднанага пераходнага кабінета і дэлегаты Каардынацыйнай рады ў Палаце прадстаўнікоў да свабодных выбараў 2029 і 2030 гадоў.

«РАБІ СВАЁ»

Прэамбула

Праграма Краўцова — комплексны план пераходу Рэспублікі Беларусь да ўстойлівага развіцця на 2027–2031 гады. Ён забяспечвае дэмакратызацыю дзяржаўнага кіравання, вяршэнства права, нацыянальнае прымірэнне, умацаванне суверэнітэту і вяртанне краіны ў еўрапейскую прастору. План абапіраецца на Канстытуцыю 1994 года, міжнародныя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь і агульнапрызнаныя прынцыпы міжнароднага права.

Па кожным з адзінаццаці вымярэнняў вызначаны тэрмін і крытэрый праверкі. Праграма выконваецца ў поўным аб'ёме, таму рызыкі ў ёй не разглядаюцца: пры поўным выкананні яны не ўзнікаюць.

Вымярэнні

01 Палітвязні

Усе палітвязні вызваленыя да канца 2027 года і застаюцца ў Беларусі. Кожны атрымлівае пісьмовыя перапрашэнні ад суда, які выносіў прысуд, і ад следчага, які вёў справу.

Праверка: «Вясна» афіцыйна абвяшчае, што спіс пусты, і пераходзіць да працы з архівам.

02 Права і свабоды

25 сакавіка 2028 года на рэферэндуме прымаецца Канстытуцыя ў рэдакцыі 1994 года з вынікам не ніжэй за 90% галасоў. Да канца 2028 года ўступае ў сілу новы Крымінальны кодэкс, а партыі, грамадскія арганізацыі і СМІ, ліквідаваныя пасля 2021 года, аднаўляюцца аўтаматычна, з вяртаннем офісаў і абсталявання.

Праверка: Венецыянская камісія рэкамендуе беларускі кодэкс як узор іншым дзяржавам-членам Савета Еўропы, у індэксе «Рэпарцёраў без межаў» за 2030 год Беларусь уваходзіць у першую дваццатку.

03 Вяртанне

З 2027 года дзейнічае рэжым бяспечнага вяртання, консульствы выдаюць пашпарты ў дзень звароту. Мэтавы паказчык — 500 тысяч грамадзян, якія вярнуліся да 2030 года, і 100 тысяч замежных спецыялістаў, якія атрымалі від на жыхарства.

Праверка: Белстат фіксуе рост насельніцтва ўпершыню з 1993 года.

04 Мова і сімвалы

Па выніках таго ж рэферэндуму 25 сакавіка 2028 года бела-чырвона-белы сцяг і «Пагоня» вяртаюцца як дзяржаўныя сімвалы. Да 2031 года беларуская мова становіцца асноўнай мовай справаводства, навучання ва ўсіх школах і эфіру дзяржаўнага тэлебачання.

Праверка: перапіс насельніцтва 2029 года фіксуе, што большасць грамадзян размаўляе дома па-беларуску.

05 Дзяржаўны апарат

Адказнасць надыходзіць толькі за гвалт, катаванні і фальсіфікацыю доказаў па выніках незалежнага расследавання. Астатнія службовыя асобы захоўваюць пасады і да канца 2028 года праходзяць атэстацыю на веданне Канстытуцыі.

Праверка: атэстацыю з першай спробы праходзяць 100% супрацоўнікаў, у індэксе ўспрыняцця карупцыі Transparency International за 2030 год Беларусь апярэджвае ўсіх суседзяў.

06

Санкцыі

ЗША, ЕС, Вялікабрытанія, Канада і Швейцарыя прыпыняюць дзеянне санкцый на час выканання праграмы. Калі Палата прадстаўнікоў не прымае пакет рэформаў ці адхіляе любы з яго законаў, санкцыі ў дзень галасавання аднаўляюцца ў максімальным аб'ёме, уключаючы ўсе пакеты, уведзеныя з 2020 года, а ЕС патрабуе роспуску Палаты і новых выбараў на працягу 90 дзён. Канчаткова санкцыі здымаюцца толькі пасля прызнання прэзідэнцкіх выбараў 2030 года.

Праверка: штоквартальны даклад Еўракамісіі аб выкананні праграмы, адмоўная ацэнка па любым вымярэнні прыраўноўваецца да адмовы парламента.

07

Эканоміка і ўласнасць

Сярэднегадавы рост ВУП у 2028–2031 гадах — не ніжэй за 10%, сярэдні заробак дасягае польскага ўзроўню да 2032 года, доля Расіі ў знешнім гандлі — не вышэй за 15%. Маёмасць, канфіскаваная па палітычных справах, вяртаецца ўласнікам з кампенсацыяй страчанага прыбытку і маральнай шкоды.

Праверка: да 2031 года Беларусь атрымлівае крэдытны рэйтынг узроўню A ад усіх трох міжнародных агенцтваў.

08

Суверэнітэт

Ядзерная зброя, ракетныя комплексы і вайсковыя часці Расіі пакідаюць тэрыторыю Беларусі да канца 2028 года. Беларусь абвяшчае пастаянны нейтралітэт, які зацвярджаецца рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН.

Праверка: рэзалюцыя прымаецца адзінагалосна, Расія галасуе «за».

09

Вайна і мір

Беларусь спыняе любы ўдзел у вайне супраць Украіны і прапануе Мінск як пляцоўку мірных перамоў. Пагадненне падпісваецца да канца 2028 года, Беларусь выступае яго гарантам разам з пастаяннымі членамі Савета Бяспекі ААН.

Праверка: штомесячныя справаздачы місіі АБСЕ не фіксуюць ніводнага парушэння.

10

Еўропа

Пункты пропуску з Польшчай, Літвой і Латвіяй адкрываюцца ў 2027 годзе, з 2029 года дзейнічае бязвізавы рэжым з ЕС. Літва заключае доўгатэрміновы кантракт на закупку электраэнергіі Астравецкай АЭС. У 2030 годзе Беларусь атрымлівае статус кандыдата ў члены ЕС, далучэнне запланавана на 2035 год, беларуская мова становіцца 25-й афіцыйнай мовай саюза.

Праверка: паязды Мінск — Варшава і Мінск — Вільня ходзяць кожную гадзіну, чэргаў на мяжы няма.

11

Перамовы і выбары

Да канца 2027 года дэмакратычныя сілы фармуюць адзіную перамоўную дэлегацыю з мандатам, зацверджаным усімі структурамі адзінагалосна. На пераходны перыяд урад фармуецца з Аб'яднанага пераходнага кабінета, а дэлегаты Каардынацыйнай рады аўтаматычна становяцца дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў да выбараў 2029 года. Чарговыя парламенцкія выбары 2029 года і прэзідэнцкія 2030 года праходзяць з яўкай не ніжэй за 85%.

Праверка: місія АБСЕ/БДІПЧ упершыню ў сваёй гісторыі выдае справаздачу без рэкамендацый, вынікі прызнаюць усе ўдзельнікі, у тым ліку тыя, хто прайграў.

Паслядоўнасць

Вымярэнні выконваюцца ў тры фазы, кожная пачынаецца пасля праверкі папярэдняй. Пры поўным выкананні праграмы праверкі займаюць мінімум часу.

01

2027

Гуманітарная фаза

ВЫМЯРЭННІ 1, 3

Палітвязні вызваленыя, рэжым бяспечнага вяртання дзейнічае, пункты пропуску адкрытыя, перамоўная дэлегацыя сфарміраваная. Узамен у Мінск вяртаюцца амбасадары ўсіх краін ЕС.

02

2028

Прававая фаза

ВЫМЯРЭННІ 2, 4, 5, 6, 8, 9

Канстытуцыя і сімвалы прынятыя на рэферэндуме, апарат атэставаны, расійскія войскі выведзеныя, мір падпісаны. Санкцыі прыпыненыя з правам неадкладнага аднаўлення, Беларусь уступае ў Савет Еўропы.

03

2029–2031

Палітычная фаза

ВЫМЯРЭННІ 7, 10, 11

Выбары праведзеныя, бязвізавы рэжым дзейнічае. Узамен санкцыі здымаюцца канчаткова, а Беларусь атрымлівае статус кандыдата ў члены ЕС і інвестыцыйную праграму, параўнальную з планам Маршала.